


# ПАДАРУНАК АД ПАЭТА-ПЧАЛЯРА

**Віншаванні з нагоды выхаду новага зборніка лірыкі прымае наш калега па Саюзе пісьменнікаў Беларусі, паэт Мікалай ІВАНОЎСКІ (Ваўкавыскі раён). Новая работа творцы атрымала арыгінальную мастацкую назву «Жужні, пчолачка, жужні!» *(Мінск, «Ковчег», 2026).***

У анатацыі да новага зборніка лірыкі беларускага паэта, жыхара ўжо вядомай многім невялічкай вёсачкі Пачуйкі сказана: *«Жужні, пчолачка, жужні!» – дзясятая кніга ў бібліяграфіі паэта з вёскі Пачуйкі Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці Мікалая Пятровіча Іваноўскага. Гэты паэтычны зборнік з'яўляецца своеасаблівым падсумаваннем жыццёвага і творчага вопыту аўтара. Кніга складаецца з пяці раздзелаў: першы мае назву «Вулей», другі – «Пчолка – мілая істота», трэці – «Паклон, мой краю», чацвёрты – «Траўнёвы ранак», пяты – «Не кідайся словам». Зборнік вершаў «Жужні, пчолачка, жужні!» будзе цікавы для шырокага кола чытачоў – як для дарослай, так і для дзіцячай аўдыторыі».*

Новае літаратурна-мастацкае выданне налічвае 104 старонкі, наклад 100 экзэмпляраў. Пераплёт цвёрды. Ёсць каляровыя фотаілюстрацыі. На тыльным баку вокладкі размяшчаюцца каляровы фотапартрэт і творчая біяграфія Мікалая Іваноўскага. Рэдактары Інга Вінарская і Вячаслаў Корбут. Калі ласка, пытайцеся новае выданне ў бібліятэках вобласці.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

# ПЧАЛЯРСКА-ПАЭТЫЧНЫЯ ШЛЯХІ МІКАЛАЯ ІВАНОЎСКАГА

Мікалай Іваноўскі на сённяшні дзень – гэта значная асоба на паэтычным небасхіле не толькі Гарадзеншчыны, але і ўсёй сучаснай беларускай паэзіі. Сведчаннем гэтага з'яўляецца шэраг ягоных кніг, выдадзеных аўтарам за папярэднія гады, разнастайных па жанрах і па тэматыцы. Сярод твораў Мікалая Іваноўскага – лірычныя вершы, байкі, загадкі, патрыятычныя творы,

пейзажная і філасофская лірыка. Адметнымі ж рысамі творчасці Мікалая Пятровіча можна назваць шчырасць, добрае веданне жыцця, удумлівасць, разважлівасць.

Дзясятая паэтычная кніга Мікалая Іваноўскага «Жужні, пчолачка, жужні!» сабрала на сваіх старонках найбольш значныя і цікавыя творы аўтара, прысвечаныя як пчалярскай навуцы, любові да пчолак, так і асноўным грамадзянска-філасофскім развагам паэта.

Аўтар выступае ў зборніку як удумлівы, часам празарлівы творца, за плячыма якога не проста жыццёвы вопыт, але і ўстойлівая грамадзянска-чалавечая пазіцыя. Кніга «Жужні, пчолачка, жужні!» прасякнута трыма асноўнымі ідэямі: любові да малой радзімы, павагі да свайго роду, любові да прыроды і навакольнага сусвету.

Кніга складаецца з пяці раздзелаў з наступнымі назвамі: «Вулей», «Пчолка – мілая істота», «Паклон, мой краю», «Траўнёвы ранак», «Не кідайся словам». Эмацыянальна і тэматычна раздзелы кнігі звязаныя паміж сабой, яны нібыта перацякаюць адзін у другі, ствараючы адчуванне цэльнага паэтычнага палатна.

Трэба адзначыць, што аўтар у цэнтры свайго зборніка паставіў пчалу, як аснову свайго ўнутранага свету. І гэта не дзіва, бо пчала мае ўласцівасці працалюбівай істоты, якая прыносіць вялікую карысць усяму жывому. Пчала ў светапоглядзе Мікалая Іваноўскага сімвалізуе беларускую гаспадыню, руплівую і гасцінную. У Год беларускай жанчыны – гэта вельмі слушны і карысны вобраз. Пчала – яна і сімвал паэзіі, дзе кожны памер, кожная страфа, думка, радок ці рыфма дакладна павінны складацца ў шматгранную форму сотаў, дзе смак паэзіі і эстэтычная дакладнасць не менш вартыя добрага мёду. У гэтым, я лічу, – асноўная задума кнігі «Жужні, пчолачка, жужні!», дзе шмат твораў, кожны з якіх фарміруе свой фрагмент сотаў у агульнай карціне зборніка.

Кнігу можна і трэба з цікавасцю чытаць, бо яна напоўненая сонечным усведамленнем багацця жыцця, разнастайнасцю яркіх фарбаў і вобразаў, якія прайшлі праз паэтычнае сэрца Мікалая Іваноўскага і абавязкова закрануць сваёй удумлівасцю кожнага аматара паэзіі.

Пісьменнік, педагог, журналіст<br>Вячаслаў Корбут

.